*М. М. ЗАБАЎСКІ*

## РАЗВІЦЦЁ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

На мяжы XVIII—XIX стст. Расійская імперыя ўяўляла сабой магутную краіну з насельніцтвам амаль 40 млн чалавек. Аднак у той час, калі ў Еўрапейскую Расію прыйшоў капіталізм, народы Сібіры і Далёкага Усходу захоўвалі яшчэ патрыярхальна-родавы ўклад. Па большасці эканамічных паказчыкаў Расія ўступала еўрапейскім краінам, і галоўным тормазам у гэтым было прыгонніцтва.

Пасля кожнага падзелу Рэчы Паспалітай на беларускіх землях уводзілася новае тэрытарыяльнае дзяленне: ваяводствы і паветы ліквідаваліся, а ўтвараліся губерні і паветы з іншымі межамі. Урэшце, з 1802 г. тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў губерні: Мінскую (1793—1921); Гродзенскую (1801—1920), да яе ў 1843 г. была далучана Беластоцкая вобласць, якая адышла да Расіі ў 1807 г.; Магілёўскую (1802—1919); Віцебскую (1802—1924); Віленскую (1801—1920). На азначаных тэрыторыях панавала буйнапамеснае дваранскае землеўладанне. 3,6 % буйных памешчыкаў (якія мелі больш за 500 прыгонных) валодалі 49,6 % усіх прыгонных, 16,9 % сярэдніх памешчыкаў (ад 100 да 500 прыгонных) мелі 34,6 % усіх прыгонных, а амаль 80 % дробных памешчыкаў (да 100 прыгонных) валодалі 15,8 % ад агульнай колькасці прыгонных сялян.

**Забаўскі Мікалай Міхайлавіч** — дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар.

Да найбуйнейшых гаспадарак у першай палове XIX ст. адносіліся: гомельскі маёнтак М. П. Румянцава (з 1835 г. графа Ф. Паскевіча). У 13 уласнапанскіх гаспадарках (фальварках) мелася за 60 тыс. дзесяцін толькі ворнай зямлі і 28 тыс. прыгонных сялян [9]. Маёнтак Дуброўна князя Ф. К. Любамірскага ў Аршанскім павеце (15 фальваркаў, 11 тыс. прыгонных, 22 тыс. дзесяцін ворнай зямлі) [3]. Маёнтак Хоцімск памешчыка А. Гальшанскага ў Клімавіцкім павеце (9 фальваркаў, 7,5 тыс. прыгонных і 40 тыс. дзесяцін ворнай зямлі). На тэрыторыі Беларусі было больш за 50 такіх гаспадарак, дзе налічвалася больш за 2 тыс. прыгонных сялян. Але зямельныя магнаты нярэдка аддавалі перавагу сярэднім маёнткам з колькасцю прыгонных ад 200 да 500. У князя Л. Н. Вітгенштэйна, які меў у 12 паветах каля 1,2—1,3 млн дзесяцін зямлі і ад 40 да 120 тыс. душ, толькі ў 6—7 са 100 маёнткаў было больш за 2 тыс. прыгонных [2]. Да ліку найбуйнейшых землеўладальнікаў адносіліся князі Любамірскія, Замойскія, Радзівілы і інш., якія валодалі дзясяткамі тысяч дзесяцін зямлі. Большасць памешчыкаў не вяла ўласнай гаспадаркі. Прыдатная для апрацоўкі панская зямля была ў карыстанні прыгонных сялян, якія плацілі памешчыкам аброк.

У першай палове XIX ст. намеціўся значны рост попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю ў Заходняй Еўропе і ў гарадах Расіі. Паколькі прадукцыя фальваркаў прызначалася на продаж і вялася на аснове паншчыны, памешчыкі паскорылі стварэнне новых фальваркаў за кошт скарачэння сялянскіх надзелаў. Сяляне ж пераводзіліся з аброку на паншчыну для апрацоўкі фальваркавых зямель. Да 1859 г. у маёнтках сярэдніх і буйных памешчыкаў у цэлым у Беларусі фальваркі займалі 65 % ворнай зямлі: у Мінскай губерні — 56 %, Магілёўскай — 65 %, Віцебскай — 63 %. У выніку сялянскае землекарыстанне скарачалася, і расла колькасць беззямельных сялян.

У 30—40-я гг. XIX ст. вызначаецца спецыялізацыя памешчыцкіх гаспадарак па перапрацоўцы зерня і бульбы на спірт. На тэрыторыі Беларусі працавалі больш за 6 тыс. вінакурань, прыбыткі ад продажу гарэлкі пастаянна ўзрасталі. У многіх памешчыкаў яны складалі да 40 % ад агульнай сумы прыбыткаў. У сувязі з ростам попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю актыўна развіваліся прадпрымальніцкія гаспадаркі прыгоннага тыпу. У цэнтральнай і паўднёвай частцы Беларусі з 1930-х гг. пачалі сеяць цукровыя буракі, адкрываліся цукраварныя заводы. На поўначы Беларусі, Магілёўшчыне і Міншчыне пашыралася льнаводства. На Гродзеншчыне сталі займацца танкаруннай авечкагадоўляй. Але шматгалінковых прадпрымальніцкіх гаспадарак, прадукцыя якіх вывозілася не

толькі на мясцовыя рынкі, але і за мяжу, было няшмат. Перш за ўсё такімі можна было лічыць гаспадаркі, у якіх выкарыстоўваліся малацілкі, веялкі, сеялкі, сячкарні, жалезныя плугі. У асноўным зямля апрацоўвалася старым інвентаром прыгонных сялян без усякай агратэхнікі. Пануючай сістэмай земляробства заставалася трохполле. Гаспадаркі дробных памешчыкаў у пераважнай большасці мелі натуральны характар.

Асновай гаспадаркі селяніна быў зямельны надзел, які ён атрымліваў ад дзяржавы або памешчыка, пры ўмове адбывання пэўных павіннасцей. Да 1842 г. колькасць памешчыцкіх сялян — 79,8 %, а дзяржаўных — 9,3 %. Нязначны працэнт складалі вольныя людзі. Да 1845 г. колькасць памешчыцкіх сялян зменшылася да 64,6 %, а дзяржаўных — павялічылася да 19,1 %. Гэта акалічнасць тлумачыцца тым, што за ўдзел у паўстанні 1831—1832 гг. маёнткі шляхты канфіскоўвалі і раздавалі «прыродным расійскім памешчыкам».

Сялянскія павіннасці вызначаліся як галоўныя і дадатковыя. У лік галоўных уваходзілі паншчына, аброк, згоны. Нормы паншчыны фіксаваліся ў інвентарах, але часта парушаліся памешчыкамі ў большы бок. Да сярэдзіны XIX ст. сяляне за карыстанне адной валокай зямлі (каля 22 дзесяцін) павінны былі адпрацаваць 12 дзён у тыдзень (па 6 дзён мужчынскай і жаночай працы). Пры меншым надзеле паншчына адпаведна памяншалася. З 1 красавіка па 15 верасня сяляне павінны былі выходзіць на працу з усходам сонца, а завяршаць яе з заходам. Пры гэтым мелася 2 гадзіны на адпачынак. З 15 верасня па 1 красавіка сяляне выходзілі на працу на досвітку, а завяршалі яе на змярканні (маючы паўтары гадзіны на адпачынак) [1, с. 189]. У пасяўны перыяд і падчас збору ўраджаю практыкаваліся прымусовыя выхады ўсіх працаздольных сялян на панскія работы (згоны). Да дадатковых павіннасцей адносілася: выкарыстанне сялянскай працы на будаўніцтве і ў час рамонту панскіх пабудоў, дарог, мастоў, перавозка грузаў, начная варта, пабудова і рамонт плацін пры млынах, падтрымка ў належным стане сельскіх запасных крам і папаўненне іх неабходнымі прапорцыямі хлеба і інш. У неўраджайныя гады памешчыкі часта аддавалі сваіх сялян на будаўнічыя работы. Заробленыя сялянамі грошы памешчыкі забіралі сабе. У дакладзе генерал-губернатара Смаленскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў Ігнацьева цару ў 1855 г. гаварылася аб масавым абнішчанні прыгоннага сялянства і вызначаліся прычыны гэтага заняпаду ў Віцебскай і Магілёўскай губернях. «...Маючы ад сялян розныя, ні якому ўліку не падлягаючыя выгады, многія памешчыкі забіраюць сабе ўсе заробленыя сялянамі грошы. Уладальнікі паштовых станцый прызначаюць фурманаў з ліку сваіх сялян,

але не плацяць за працу, даюць толькі адзенне, а сем'і прымушаюць адбываць баршчыну за іх» [1, с. 199]. Усё большая колькасць сялян была не ў стане выконваць павіннасці. Памешчыкі за гэта маглі пазбавіць іх зямельнага надзелу ці накіраваць у рэкруты.

Казённыя сяляне пакутавалі ад свавольства арандатараў, якія імкнуліся выкарыстаць любыя магчымасці для атрымання прыбытку і пастаянна павялічвалі павіннасці сялян. Аб разарэнні арандатарамі скарбовых сялян паборамі адзначалася ў паведамленні Віцебскай казённай палаты ў Дэпартамент дзяржаўных маёмасцей [1, с. 175].

Аб стане сялянскіх гаспадарак можна меркаваць з даклада генерал-губернатара Ігнацьева цару: «...Шматлікія беларускія памешчыкі ставяцца да сялян, як да матэрыяльна вытворчых сіл. <...> Амаль паўсюдна існуе звычай, пасля збору з палёў і агародаў сялянамі хлеба, забіраць у іх увесь ураджай і звозіць яго на панскі двор, прадстаўляючы сялянам магчымасць харчавацца гароднінай; а са снежня ці студзеня пачынаюць з узятага хлеба выдаваць гарнцы жыта, змешанага з аўсом і ячмянём па колькасці працоўных душ; тыя, хто не працуе, харчуюцца хто чым можа. Паняцце аб уласнасці амаль страчана. Зіма, вясна і лета праходзяць у пастаяннай працы і галодных пастах. Увосень селянін лічыць сябе шчаслівым, калі яму ўдаецца ўкрасці з уласнага поля некалькі снапоў хлеба» [1, с. 198—199].

У 1844—1846 гг. амаль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі былі неўраджаі, якія суправаджаліся гібеллю хатняй жывёлы. Менавіта на гэтыя гады прыпадаюць хваляванні сялян, якія адмаўляліся ад выканання павіннасцей. Масавыя былі зафіксаваны ў красавіку 1847 г. у Віцебскай губерні і ахапілі дзясяткі населеных пунктаў і сотні ўдзельнікаў. Для спынення хваляванняў былі прыцягнуты воінскія каманды [1, с. 202—203]. Аб становішчы ў губерні ў рапарце на імя цара ад 24.12.1832 паведамляў Віцебскі губернатар [1, с. 154—158]. З 1829 па 1834 г. назіраліся хваляванні прыгонных сялян князя Сапегі ў Быхаўскім павеце. Удзельнікі адмаўляліся выконваць павіннасці, плаціць чынш і інш. [1, с. 162] У 1856—1858 гг. масавыя выступленні супраць прыгону адбыліся ў 24 маёнтках, а з 1858 па 1860 г. — у 42. З іх 11 былі падаўлены вайскоўцамі і паліцыяй. У 1842 г. сяляне розных вёсак Віцебскай губерні пакідалі сядзібы і, захапіўшы з сабою маёмасць, імкнуліся дасягнуць Прусіі. Намаганнямі паліцыі больш за 80 чалавек былі вернуты на тэрыторыю губерні [1, с. 182—185]. Усім было зразумела, што прыгоннае права — гэта парахавы склеп пад дзяржавай. Урадавыя колы са справаздач губернатараў ведалі аб стане сялян у заходніх губернях, дзе былі «празмернымі іх падаткі на карысць

памешчыкаў». У 1839 г. П. Д. Кісялёў прапанаваў увесці абавязковыя інвентары, якія б абаранялі прыгонных ад канчатковага разарэння. Камітэт па справах заходніх губерняў з 1840 г. пачаў займацца выпрацоўкай умоў інвентарнай рэформы.

У адпаведнасці з царскім Указам ад 15 сакавіка 1844 г. Камітэтам заходніх губерняў было зацверджана Палажэнне аб стварэнні губернскіх камітэтаў для ўвядзення інвентароў [4]. У маі 1844 г. генерал-губернатары прадпісалі губернатарам зацвердзіць губернскія інвентарныя камітэты для складання і разгляду інвентароў памешчыцкіх маёнткаў. У камітэты ўваходзілі царскія чыноўнікі і прадстаўнікі дваранства. Існуючыя інвентары павінны былі зацвярджацца ў тым выглядзе, у якім яны былі прадстаўлены памешчыкамі, а калі інвентароў не было, то складаліся новыя, якія фіксавалі павіннасці сялян на час складання дакумента. Інвентары зацвярджаліся на 6 гадоў, на працягу якіх меркавалася выпрацаваць новыя, канчатковыя правілы. Сэнс мерапрыемства заключаўся ў тым, што інвентары, якія былі раней неабавязковымі дакументамі, уводзіліся ва ўсіх памешчыцкіх маёнтках і павіннасці з сялян можна было патрабаваць толькі тыя, якія былі запісаны ў інвентары. Для паскарэння працэсу прадстаўлення інвентароў памешчыкамі генерал-губернатары прадпрымалі і меры прымусовага характару з прыцягненнем земскіх спраўнікаў і павятовых прадвадзіцеляў дваранства [5].

Пасля выдання інвентарных правілаў, калі пачасціліся чуткі аб магчымым вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці, памешчыкі абеззямельвалі іх, а забраныя землі здавалі ў арэнду. Так, у ходзе праверкі інвентароў у Магілёўскай губерні Часовым люстрацыйным камітэтам высветлілася, што іх уладальнікі паказвалі колькасць зямлі, якая павінна была адносіцца да сялянскіх надзелаў, а на самай справе ў іх карыстанні не з'яўлялася. Па гэтай прычыне 22 сакавіка 1852 г. Міністэрствам унутраных спраў было пастаноўлена перакласці інвентары ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі [6]. Ад памешчыкаў патрабаваліся дадатковыя звесткі аб тых маёнтках, а таксама звесткі аб тым, што ўказаныя ў інвентарах землі знаходзяцца сапраўды ў карыстанні сялян [7]. Асноўным палажэннем новых правілаў была неадчужальнасць сялянскай зямлі.

Перагледжаныя ў губернскіх камітэтах інвентары паступілі праз шэраг інстанцый на абмеркаванне Агульнага сходу Дзяржаўнага Савета ў маі 1855 г. Згодна з новымі правіламі паншчына вызначалася з цягла ў памеры 3 дзён мужчынскай і столькі ж жаночай працы ў тыдзень. У залік паншчыны ішла і падводная павіннасць. Дадатковыя работы і натуральныя пабогы скасоўваліся. Зямля была недатыкальнай уласнасцю памеш-

чыка, але ён быў абавязаны вылучаць у карыстанне селяніна не менш як 3,8 дзесяціны прыдатнай зямлі на рэвізскую душу [8].

Такім чынам, пасля паўстання 1830—1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі царызм пачынае шукаць падтрымкі сялян у барацьбе з польскім нацыянальна-вызваленчым рухам, і інвентарная рэформа, безумоўна, насіла і палітычны характар. Акрамя таго, інвентарная рэформа прымушала памешчыкаў заходніх губерняў задумацца аб скасаванні прыгоннага права [8, с. 32].

Канчаткова прымусілі Аляксандра II паскорыць правядзенне сялянскай рэформы не толькі крызіс феадальна-прыгонніцкага ладу і палітычныя супярэчнасці ў краіне, але і паражэнне Расіі ў Крымскай вайне.

## ЛІТАРАТУРА


1. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2 (1772—1903 гг.). Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940.
2. *Конан, У. М.* Вітгенштэйны / У. М. Конан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі. Т. 2. 1994.
3. *Насевіч, В.* Дуброўна / В. Насевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі. Т. 3. 1996.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 21875.
5. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 17358.
6. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 23532.
7. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 21875.
8. *Рацько, А. Ф.* Распрацоўка і правядзенне інвентарнай рэформы ў Беларусі (40—50-я гг. XIX ст.) (Палітычныя, сацыяльна-эканамічныя і этнакультурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў XIX — пачатку XX ст.: Да 150-годдзя скасавання прыгоннага права ў Расійскай імперыі: матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., г. Мінск, 4 сак. 2011 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка; рэдкал.: А. І. Андарала, В. В. Бушчык, М. М. Забаўскі [і інш.]. Мінск : БДПУ, 2011.
9. *Сіманікоў, С.* Румянцаў / С. Сіманікоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі. Т. 6. Кн. 1. 2001.


## РЭЗЮМЭ. SUMMARY


Анализируется положение помещичьего хозяйства в Беларуси в первой половине XIX в., определяются пути получения прибыли; рассматривается положение крестьянского хозяйства и значение инвентарной реформы в социально-правовом аспекте.

The author of the article analyses the condition of landowner property on the territory of Belarus in the first half of the 19th century, determines the ways of landowners' profit, examines the state of small peasant farms and the importance of the property inventory reform in the social and legal aspect.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 12 студзеня 2010 г.